УДК 398 (4Беи )

***І.А. Швед***

# ДЭНДРАЛАГІЧНЫЯ СІМВАЛЫ Ў ЖАНРАХ ВУСНАЙ ПАЭЗІІ БЕЛАРУСАЎ

У дадзенай працы пры дапамозе функцыянальна-семантычнага і структурна-тыпалагічнага метадаў даследуецца семантыка дэндралагічных сімвалаў у жанрах вуснай паэзіі беларусаў. Устаноўлена, што міфапаэтычная семантыка дэндралагічных сімвалаў выяўляе адметныя аспекты і ў розных жанрах вуснай паэзіі, і ў розных формах беларускай традыцыйнай культуры. Усталёўваючы парадыгматычныя адносіны з сімваламі іншых кодаў, дэндралагічныя сімвалы падпарадкоўваюцца канкрэтным сінтагматычным адносінам і, у залежнасці ад кантэксту твора пэўнага жанру, здольны выяўляць амбівалентныя значэнні, звязвацца з сістэмай устойлівых касмалагічных, прыродных і метафізічных апазіцый.

**Уводзіны**

Дэндралагічныя сімвалы, функцыянуючы ў розных жанрах вуснай паэзіі беларусаў, акумулююць глыбінныя сэнсы культуры, мадэліруюць вызначаныя феномены ў пачуццёва-канкрэтнай форме і выклікаюць устойлівыя асацыяцыі на падставе традыцыйных сэнсавых атаясненняў. Нездарма цікавасць да этнабатанікі, функцыянавання дэндралагічных сімвалаў у традыцыйнай культуры ўстойліва захоўваецца з самых першых крокаў развіцця славянскай, у тым ліку беларускай, фалькларыстыкі і выявілася як у сферы збіральніцкай дзейнасці і публікацыі экспедыцыйных матэрыялаў, так і ў спробах уключэння гэтых даных у міфалагічныя даследаванні, у навуковыя росшукі ў галіне славянскіх старажытнасцей і пад. (А. Афанасьеў, В. Вадарскі, Д. Зяленін, С. Максімаў, К. Машыньскі, М. Нікольскі, А. Патабня, М. Федароўскі, А. Фішар і інш.). Дэндралагічныя сімвалы фальклору розных славянскіх традыцый траплялі ў поле зацікаўленняў многіх сучасных даследчыкаў (Т. Агапкіна, Д. Айдачыч, Е. Бартміньскі, Г. Барташэвіч, Л. Вінаградава, А. Грэймас, В. Іваноў, В. Коласава, М. Марчэўская, А. Ненадавец, У. Пятрухін, Л. Радэнкавіч, Л. Салавей, М. Талстой, С. Талстая, А. Тапаркоў, У. Тапароў, Т. Цыўян, І. Чарота, Т. Шамякіна і інш.). Яны выказалі розныя, нярэдка ўзаемавыключныя меркаванні наконт генезісу (паходжання, станаўлення і развіцця) і семантыкі названых феноменаў. Аднак асаблівасці функцыянавання дэндралагічных сімвалаў у сістэме жанраў вуснай паэзіі беларусаў да гэтага часу не ўстаноўлены, што і з'яўляецца мэтай дадзенай працы. Пры вызначэнні спецыфікі міфапаэтычнай семантыкі дэндралагічных сімвалаў асноўная ўвага акцэнтуецца на тых жанрах беларускага фальклору, у якіх дэндралагічны код найбольш поўна выявіў сваю сутнасць.

* * *

Усталёўваючы парадыгматычныя адносіны з сімваламі іншых кодаў, дэндралагічныя сімвалы падпарадкоўваюцца канкрэтным сінтагматычным адносінам і, у залежнасці ад жанравага кантэксту, здольны выяўляць амбівалентныя значэнні, звязвацца з сістэмай устойлівых касмічных, прыродных і метафізічных апазіцый.

У калядных, валачобных, траецкіх, купальскіх, хрэсьбінных, вясельных песнях, замовах, загадках, чарадзейных казках, дзіцячых прыгаворах, звязаных з каляндарна-абрадавай традыцыяй, формулах пра паходжанне дзяцей дрэва выступае знакам ключавога месца-часу, сімвалам касмічнай арганізацыі (*«Пасярод двара маладога Пятра. // Вырас дубок тонак, высок. // З-пад таго дубка узышла зорка, // З-пад той зорачкі ўзышлі звёздачкі. // Ёсць той дубок – Іванка-сынок, // Ёсць тая зорачка – яго*

*жоначка, // Ясныя звёзды – яго дзетачкі»* [1, с. 233]), сродкам мадэліравання касмічных пераходаў, сродкам-знакам кантакту з іншасветам, медыятарам ці мяжой паміж рознымі сферамі светабудовы. У замовах міфалагічнае дрэва сваімі шматлікімі часткамі ахоплівае Сусвет з усіх бакоў: *«На сінім Буяне, на сінім акіяне стаіць кіт-дрэва на ста карнях, на ста вярхах, на ста какатах. Там жыве сама гадзіна Кацярына…»* [2, с. 116]; *«На моры, на кіяні рос дрэва купарос, з камля і да верха галлём апусьціўся. А на сінім моры ляжыць сіней медзі камянь…»* [2, с. 327]. Вакол Сусветнага дрэва групуюцца прадстаўнікі-*цары* ўсіх трох ярусаў светабудовы – да прыкладу, заяц з поля, месяц з неба, шчупак з мора. Дрэва можа маркіраваць толькі адзін са складнікаў свету: *«На небі – месяц малады, у лесі – дуб таўсты, а ў полі – камень сяды; як етым тром царам умесці не бываць, мёду-віна не піваць, так і маім зубам не шумаваць»* [2, с. 181]. Дрэвы, пні могуць быць адмысловымі ахвярнікамі, як у замове ад урокаў: *«Мылас на моры ўроком-пророком: от завісці, от радосці, от молодосці, от дзевічого, от чорного, от белого, от серого, от белорукого, от цыганского, от зубного, от балгарского языка. Я вас на морэ пошлю, разные напіткі выстаўлю на сухіе пне, на гнілые колоды. Там Спасіцель печаць несе, знамя несе ў (імя) болезнь одбіраць. На сінем моры ангелы роспеваюць, у (імя) болезнь одбіраюць»* [ФЭАБ; Аздамічы Столінскага р-на].

Для небыліц характэрна травестацыя вобраза Сусветнага дрэва, дрэва размяшчаецца ў незвычайных месцах і выконвае надзвычайныя функцыі – да прыкладу, дуб стаіць на кабыле, вырастае спачатку пад самую страху, потым дасягае неба; маладым дубам звязваюць адсечаны зад кабылы [3, с. 540] і пад. У чарадзейных казках з матывамі засыхання дрэва, выцякання з яго крыві дрэва функцыянуе як сродак аднаўлення перапыненых зносін паміж разлучанымі героямі, а з матывамі падвязвання, палівання дрэў, збірання іх пладоў, набыцця чароўных яблыкаў у выніку складаных выпрабаванняў – як сродак устанаўлення кваліфікацыі героя, зацвярджэння яго ў той ці іншай ролі. У паданнях дрэвы маркіруюць месца, дзе ўтвараюцца паселішчы людзей. У былічках, легендах, паданнях, павер'ях дрэва – месца здзяйснення злачынстваў, локус тагасветных істот і людзей, надзеленых статусам пераходнасці. Дрэва функцыянуе і як аб'ект, у які ператвараюцца дэманічныя істоты, і як прылада, пры дапамозе якой яны выконваюць свае злыя намеры, і разам з тым як сродак распазнання ведзьмаў, злодзеяў і пад.

У фальклорных жанрах, звязаных з хрысціянскай тэматыкай (легенды, духоўныя вершы, павер'і), дрэвы растуць у Віфліеме, раі, каля ракі, маркіруюць сакральны цэнтр, месца нараджэння Хрыста, збору ўсіх святых на чале з Богам, выступаюць партнёрамі па камунікацыі, сховішчам Святой радзіны, локусам з'яўлення Хрыста, Божай Маці (яе рыз), святых, ікон, а таксама з'яўляюцца матэрыялам для будоўлі храмаў. Надзеленае спагадай, чуласцю, дабрынёй ці пачуццём страху, жорсткасцю, дрэва можа як схаваць, абараніць, выратаваць Божую Маці і Хрыста, так і не прыняць іх пад сваю ахову, здрадзіць, выдаць ворагам. У «Галубінай кнізе», дзе прадстаўлены пытанні (і адказы на іх) пра першынство і старэйшасць розных элементаў светабудовы, галоўным у дэндралагічнай іерархіі выступае *«купарэс-древо»*. Такая вызначанасць дрэва абумоўлена тым, што на ім у час нараджэння Ісуса Хрыста з'явіўся крыж, ці тым, што на *«купарэс-древе»* Хрыстос быў распяты. Біблейская тэма інтэрпрэтуецца таксама ў беларускіх народных жартах тыпу *«Ці доўга Адам з Евай жылі ў раю? // – Пакуль яблыкі паспелі»* [4, с. 64]. На шкале этычнай (дабро/зло), эстэтычнай (прыгожае/непрыгожае) і прагматычнай (карыснае/шкоднае) ацэнак дрэва ў т.зв. «народнай Біблii» звязваецца пераважна з першымі членамі абазначаных бінарных апазіцый. Выключэнне складаюць легенды, якія распрацоўваюць сюжэты пра тварэнне свету Богам і/ці яго «негатыўным дублёрам» чортам, пра паходжанне дрэў са слёз сакральнага персанажа (рабіны – з крывавых слёз Евы, крушыны – са слёз д'ябла),

а таксама аб прakляцці дрэў за шкоду, прычыненую Хрысту, Божай Маці, святым. У выніку дрэвы, узнікненне якіх звязана з чортам ці якія спрыялі яму (або Іудзе) і непрыстойна сябе паводзілі ў адносінах да вярхоўных прадстаўнікоў Боскай іерархіі, аказваюцца шкоднымі. Паводле забарон (і іх матывіровак), такія дрэвы не садзяць каля хаты (не ўносяць у хату), пад імі не стаяць у час маланкі. І наадварот, дрэвы, добраславёныя за спрыянне сакральным персанажам, паводле легендарных матывіровак абрадавых дзеянняў (да прыкладу, упрыгажэнне яліны на Каляды, калядная гульня з арэхамі ў цот і лішку), а таксама традыцыйных правіл, выступаюць аб'ектам шанавання, надзяляюцца прадуцыравальнай і ахоўнай функцыямі (у прыватнасці, пад такія дрэвы прадпісваецца хавацца ў час навальніцы). Паводле павер'яў, былічак, праклёнаў, людзі, якія знішчаюць вызначаныя традыцыяй дрэвы, цяжка караюцца – нават смерцю. Матэрыялы павер'яў, забарон, правіл, звязаных з выбарам пэўнага дрэва для ўжывання з утылітарнымі мэтамі, сведчаць пра тое, што тэхналагічныя маніпуляцыі з ім у многім матываваліся міфапаэтычнымі ўяўленнямі. Асаблівасць выбару драўніны на будоўлю – абавязковасць уваходжання матэрыялу ў тую частку універсальнай класіфікацыі свету, якая суадносіцца са станоўчай парадыгмай значэнняў: жыццём, дабрабытам, плоднасцю, чыстатой.

У тэкстах малых жанраў, звязаных з абрадам ці рытуалам, каляндарна-, сямейна-абрадавых песнях, сацыяльна-бытавых і сямейна-бытавых песнях, баладах, чарадзейных казках, казках пра жывёл, сацыяльна-бытавых казках, легендах дрэва (як і ў фальклорных жанрах, звязаных з хрысціянскай тэматыкай) выступае партнёрам чалавека (ці іншай істоты) па камунікацыі. Так, у чарадзейнай казцы чалавек чакае ў купальскую ноч расцвітання папараць-кветкі, засынае і *«чуе дзерава крычыць: "Уцякай адсюль. Уцякай, бо цябе заб'е" ...праўда... Бура проста абярнула і забіла б яго, бы ляжаў»* [3, с. 346]. Вярба, яблыня і груша функцыянуюць як персанажы формул-зваротаў беларускага земляробчага календара. У веснавых, восеньскіх песнях, песнях пра каханне, сацыяльна-бытавых песнях, чарадзейных казках, казках пра жывёл і расліны (казкі аб раслінах аднесены Аарнэ, Андрэевым і Томпсанам у канец раздзела «Казкі аб жывёлах») да дрэва звяртаюцца па параду, бо яно ўсё ведае і адказвае таму ці іншаму герою, перажывае за яго, вяшчуе яму лёс (бывае – нешчаслівы). У апошнім выпадку дрэва праклінаюць, абяцаюць яго знішчыць – як у песні пра каханне: *«Пашла дзеўка хусце мыці // І з яварам гаварыці. // – Цяпер явар ты зялён, // Цяпер явар ты харош, // А як прыдзе ды на цябе мароз, // Буйны вецер, дробны дождж, // Тваё лісцейка абарве, // Тваё лісцейка пажане. // Цяпер дзеўка малада, // Цяпер дзеўка хараша, // А як пойдзеш ты замуж, // Будзе ліха да твой муж, // Тваю коску абарве, // Тваю слёзаньку разалье. // – Каб ты, явар, не даждаў, // Як усю праўду расказаў. // А я маю два брацці, // Вялю явар рубаці...»* [5, с. 147–148]. У прыгаворах-заклінаннях, якія суправаджаюць рытуальныя дзеянні з асвечанымі галінкамі вярбы (сцёбанне людзей, пераважна дзяцей, выгнанне жывёлы), гэтае дрэва выступае сімвалам жыццёвай сілы, пладавітасці, росту, надзяляецца абарончымі функцыямі (*«Свішчэнною вырбою абходылы корову, шоб літом ны кусалы говодні»* [ФЭАБ; Асаўцы Драгічынскага р-на]; пры сцябанні вярбой прыгаворвалі: *«Не я б'ю – вярба б'е. // За тыдзень – Вялікдзень. // Будзь багаты, як зямля, // Будзь здаровы, як вада, // Як лёд – на ўвесь год»* [ФЭАБ; Чэрнічы Жыткавіцкага р-на] і пад.). У прыгаворах пры варожбах (якія маюць матрыманіяльны характар і з'яўляюцца адрасаванай рэплікай, прызванай выклікаць у адрасата адказную рэакцыю ў выглядзе сну) дрэва (лес, гай) выступае локусам з'яўлення суджанага. У народных тлумачэннях сноў вобразу дрэва прыпісваюцца такія важныя сэнсы, як шчасце, радасць, здароўе, багацце, шлюб ці гора, сум, хвароба, беднасць, разлука, адзінота і пад. У вобразных формулах-каментарыях да рытуальных паводзін, звязаных з прадуцыраваннем ураджаю, дрэва (ці яго галіны) супастаўляецца з

добрым ураджаем ільну, аўса, канюшыны і пад. Калі жаданым вынікам магічнага дзеяння з’яўляецца каханне пэўнай асобы, «мужчынскае» і «жаночае» дрэвы сімвалізуюць адпаведна хлопца і дзяўчыну (дарэчы, тую ж сімволіку дрэвы маюць у варожбах пра шлюб). У прыкметах і правілах стан дрэва інтэрпрэтуецца як знак, як адрасаваная чалавеку рэпліка.

У чарадзейных, легендарных, сацыяльна-бытавых, навелістычных казках, легендах (у тым ліку тых, што інтэрпрэтуюць біблейскія сюжэты), паданнях, былічках, замовах дрэва функцыянуе як арыенцір, локус і аб’ект уздзеяння розных персанажаў, а яшчэ як персанаж, што актыўна дзейнічае. У калядных, траецкіх, купальскіх песнях, былічках, павер’ях дрэвы выступаюць як локусы, што ўвасабляюць шлях міфалагічных персанажаў. У замовах, адкляццях на дрэва (ці лес) адпраўляюцца розныя немачы. У замовах з матывам абмену паміж чалавекам і яго дзіцём, з аднаго боку, і міфалагічным персанажам і яго дзіцём – з другога, дрэва выступае пасрэднікам, з якім заключаецца дамова: *«У тэбэ, зэлэна бэроза, дэвять дочок, а ў мэнэ – дэвять сыноў. Будьмо мы братамы, сватамы, прыятэлямы. Тобі, зэлэна бэроза, у полі шуміты, а тобі (імя) з мамою ўсю ночэньку спаты»* [ФЭАБ; Аўсямірава Столінскага р-на]. У казках пра расліны дрэвы спрачаюцца за сваё першынство. У чарадзейных казках дрэва – перашкода для злых сіл, якія насцігаюць героя, пасрэднік, што дапамагае герою нейтралізаваць адмоўнае ўздзеянне *sacrum*, утрымальнік жыццёва важных субстанцый і прадметаў. Акрамя жыццесцвярджальнай семантыкі, дрэва ў чарадзейных казках, а таксама легендах, былічках, павер’ях можа надзяляцца маральнымі якасцямі і ўспрымацца як адмысловы каталізатар праўды.

У жанрах каляндарна-, сямейна-абрадавага і пазаабрадавага фальклору беларусаў праз пасрэдніцтва дэндралагічнага кода шматаспектна мадэліруецца вобраз чалавека. Асаблівасці псіхічнай дзейнасці чалавека, яго эмацыянальны і фізічны стан атрымліваюць інтэрпрэтацыю з пункту погляду іх культурнай каштоўнасці. У парэміях прыметы дрэва (яго частак) асацыіруюцца з псіхафізіялагічнымі, разумовымі, маўленчымі ўласцівасцямі чалавека. Канататыўнае значэнне такіх выказванняў звычайна пераважае над іх рэферэнцыйнай функцыяй. Псіхічны і фізічны стан чалавека не проста апісваецца – перажытым здарэнням, з’явам надаецца пэўная ацэнка, эматыўнасць, адбываецца чляненне і катэгарызацыя жыццёвай прасторы, а таксама фарміраванне каштоўнасна-эмацыянальных адносін макраполя «чалавек» да кантынуума навакольнага свету. У такіх сітуацыях, як і пры выкананні дэндралагічным сімвалам ролі Сусветнага дрэва, актуалізуецца медыятыўная функцыя дрэва: пад ім адбываецца любоўная сустрэча маладых людзей, дзяўчына «губляе вянок», караецца за гэта і да т.п. З медыятыўным, прадуцыравальным значэннем дрэў звязаны шырокія магчымасці рэалізацыі імі любоўна-шлюбнай сімволікі. Акрамя таго, што дрэвы абазначаюць жаніха і нявесту (прычым кожны з двух родаў, якія ўдзельнічаюць у комплексе вясельных абрадаў, супастаўляе, як правіла, процілеглы бок з дзікарослымі дрэвамі, а свой – з акультуранымі), сувязь з колам уяўленняў пра шлюбную сімволіку дрэў можна адзначыць у матывах вянчання маладых каля дрэў. Значная колькасць даных (сярод іх і сучасныя запісы) сведчыць пра тое, што дрэвы маюць непасрэднае дачыненне да сімволікі дзетанараджэння. Суаднесенасць дрэў з цяжарнасцю і родамі выяўляецца ў выкарыстанні дрэў у пранімальнай магіі, у павер’ях пра знаходжанне немаўлят на дрэвах (ці пад імі), што актуалізуе медыятыўную семантыку дрэва. У сямейна-абрадавых (у прыватнасці вясельных), сацыяльна-бытавых, жартоўных песнях, баладах, вясельных звычэннях часткі дрэва асацыіруюцца з часткамі чалавечага цела. У шэрагу баладных матываў склад частак Сусвету суаднесены са складам частак чалавечага цела на аснове адзінства касмаганічнага і антрапаганічнага міфаў: *«А ў рацэ вада – усё сляза мая... // Каля рэк трава – усё й каса мая… // Ў лузе каліна – усё й краса мая...*

// *Бела бяроза – усё й ліцо маё…»* [6, с. 411]; *«Шчучка рыбачка – то целца маё»* [6, с. 410]; *«У садочку цвяточкі – мае ясныя вочкі»* [6, с. 412]. Дрэва і яго часткі (плады, галіны, лісце) сімвалічна суадносяцца як бацькі і дзеці. У вясельных песнях, песнях пра каханне страту дзяўчынай цнатлівасці сімвалізуюць ламанне дрэва, маніпуляцыі з яго пладамі – вішнямі, яблыкамі, грушамі, калінай, арэхамі. У лічылках валоданне яблыкам абазначае выхад, які на міфалагічным узроўні прыраўноўваецца да смерці.

У народнай драме вобразы дрэў могуць выяўляцца як у «сакральна», так і «прафанна» арыентаванай форме. Дрэвы сімвалізуюць людзей, іх шлюбна-эратычныя адносіны і разам з тым маркіруюць месца значных падзей (да прыкладу, песні, якія ўваходзяць у склад *«Жаніцьбы Цярэшкі»*, *вешання (цягання) калодкі* (якое адбывалася на Масленіцу), драматычнай гульні *«Тур»*). Дрэвы, кусты, а таксама іх плады з'яўляюцца атрыбутамі міфалагічных персанажаў, у прыватнасці, арэх, арэхавы або ліпавы куст – *Яшчура* з аднайменнай калянднай гульні. Тое ж характэрна і для гульняў, якія перайшлі ў разрад дзіцячых. Дрэвы прадстаўляюць *чужы* свет, дзе галоўнага персанажа чакае смерць – як у песнях, што суправаджаюць *ваджэнне казы*. У такіх песнях дзед – павадыр *казы* – садзіцца ў зялёным садзе пад яблыняй ці грушай. У песнях, звязаных з калядными і веснавымі карагодамі і гульнямі, рэпрэзентаваны ўвесь вегетатыўны цыкл пладовых дрэў (у прыватнасці грушы). Прычым ён поўнасцю залежыць ад дзяўчат. Медыятыўная, прадуцыравальная, ахоўная семантыка дрэва прадстаўлена ў структуры прыгавораў-матывіровак, якія функцыянуюць у складзе абрадаў ці абрадавых гульняў.

Антытэза жыцця і смерці, разнесеная па полюсах мадэлі свету, можа выяўляцца ў кантраставанні «верху» (кроны), «сярэдзіны» (ствала) і «нізу» трох'яруснага дрэва. Калі дэндралагічны сімвал, звязаны з сусветнай вертыкаллю і стваральным пачаткам, увасабляе сямейнае дрэва, аб'ект валодання дрэва сімвалізуе аб'ект валодання сям'і. Дрэва з адламанай галінай ці верхавінай увасабляе непаўнату сям'і, адсутнасць яе членаў – памерлых бацькі, маці ці дачкі-нявесты, якая далучаецца да сям'і мужа. Паказальна, што хоць *той* свет, куды адыходзяць душы памерлых, паводле шэрагу павер'яў, былічак, чарадзейных казак, лакалізуецца ў каранях Сусветнага дрэва, у падзем'і, сямейна-абрадавыя песні трывала асацыіруюць вобразы памерлых бацькоў менавіта з верхавінай сямейнага (тут = Сусветнага) дрэва, а не з яго каранямі. Такая суаднесенасць, на нашу думку, карэлюе з ідэяй кругазвароту жыцця і смерці, а яшчэ выяўляе найвышэйшую каштоўнасную характарыстыку бацькоў. Прычым у шэрагу кантэкстаў «мужчынскае» дрэва (явар, дуб) можа асацыіравацца з мужчынскай лініяй сям'і і абазначаць бацьку, адросткі – гэта сыны; жаночую лінію сімвалізуе «жаночае» дрэва (да прыкладу, бяроза, ліпа). Разам з тым у вясельных песнях праз вобраз няцэлага сямейнага дрэва рэалізуецца ідэя сіроцтва; вобраз такога дрэва адначасова ўвасабляе нявесту ці жаніха сірот, раскрывае свет іх перажыванняў з нагоды страты бацькоў і сцвярджае ідэал поўнай сям'і ў яе гарманічным суіснаванні з сусветным цэлым. Нявеста, як і памерлыя бацькі, можа суадносіцца з верхавінай дрэва, ламанне верхавіны абазначае страту дачкі яе сям'ёй. У такіх кантэкстах назіраецца адыход ад ідэі сямейнага дрэва як варыянта Сусветнага дрэва і праекцыя на ўласна абрадавую рэчаіснасць, дзе дрэва канкрэтнага віду выступае аб'ектам абрадавага дзеяння і актуалізуе ідэю пераходнасці.

У каляндарна-, сямейна-абрадавай і пазаабрадавай лірыцы вобразы дрэва і чалавека судакранаюцца на функцыянальнай аснове. Паміж акцыянальнымі характарыстыкамі дрэва і асаблівасцямі дзеянняў чалавека (якія часта перадаюць эмацыянальны стан лірычнага героя) устанаўліваюцца традыцыйныя суадносіны. Але ў абрадавай лірыцы ўнутраны эмацыянальны стан героя (весялосць, сум, гараванне і інш.) сімвалізуецца на функцыянальным узроўні суадносін кампанентаў вобразнага

паралелізму, да прыкладу: хіліцца (асіна) – сумуе (дзяўчына). Дрэва выступае персаніфікаваным вобразам чалавека (асіна – дзяўчына), удзельніка пэўнага абраду: у хрэсьбінных песнях явар (*зеляненькі*) увасабляе кума (*маладзенькага*), вішня (*зеляненькая*) – куму (*маладзенькую*), вярба (*сукаватая*) – бабку-павітуху (*усю гарбатую*) [7, с. 298]; у вясельных песнях дрэва можа выступаць двайнікам нявесты. У пазаабрадавай лірыцы вобраз дрэва звычайна пераўтвараецца, яго персаніфікаваны характар страчвае свае пазіцыі. Дрэва сімвалізуе ўнутраны стан героя, дрэвы розных відаў выступаюць абагульненымі сімваламі тых ці іншых унутраных праяў яго эмацыянальнай сферы (асіна – сум, гараванне). У казацкіх, салдацкіх, турэмных, прымацкіх песнях, сямейна-бытавых песнях пра жыццё жанчыны ў мужавай сям'і схіленае, зламанае, сухое дрэва адлюстроўвае глыбокія інтымныя пачуцці, сімвалізуе тугу, моцныя перажыванні блізкіх людзей, якія вымушаны расстацца, а таксама прадказвае сумныя падзеі. Са стэрэатыпным успрыманнем дрэў як здольных да псіхічнай дзейнасці суб'ектаў звязаны матывы этыялагічных легенд, а таксама сацыяльна-бытавых і сямейна-бытавых песень, дзе дрэвы чуйна рэагуюць на чалавечае гора, іх карані сохнуць ад слёз героя (да прыкладу, у салдацкіх песнях – ад матчыных слёз), а вяршыні ламаюцца ад гора. Падобныя матывы знайшлі адлюстраванне і ў прыпеўках. У сямейна-абрадавых (у прыватнасці вясельных), сямейна-бытавых і сацыяльна-бытавых песнях дрэва, якое перагароджвае дарогу, сімвалічна асацыіруецца са звужэннем сямейных сувязей лірычнага героя. Дрэва, надзеленае прыметамі стадыяльнасці, стала матэрыялам для асэнсавання тэмпаральнасці чалавека. У галашэннях дрэва, з аднаго боку, функцыянуе як локус, дзе чакаецца з'яўленне памерлага, а з другога – дрэва ці яго часткі ўвасабляюць чалавека, часта такога, што памёр дачасна, не расходаваў жыццёвую патэнцыю. Адпаведна акцэнтуюцца такія характарыстыкі дрэва, як маладосць, незакончаная вегетацыя, гвалтоўнае знішчэнне, дынаміка руху, звязаная з нізам ці аддаленнем. Тое ж характэрна для балад – да прыкладу: «*Провожала маты // Сына ў солдаты, // Молоду нэвістку // Слала лён ірваты. // – Як нэ вірвеш лёну, // Не вэртайсь додому, // Стань у чыстым полю // <u>Молодой тополлю</u>…*» (падкрэслена намі. – І. Ш.) [ФЭАБ; Амельянец Камянецкага р-на]. У каляндарна-, сямейна-абрадавай і пазаабрадавай лірыцы, як і ў замовах, парэміях, заканамернасці чалавечага жыцця суадносяцца з нязменнымі законамі развіцця дрэва. Немагчымасць вяртання да жыцця сухога дрэва карэлюе зневерагоднасцю рэалізацыі тых ці іншых падзей у жыцці чалавека. У замовах дрэвы, пазбаўленыя сваіх характэрных частак, увасабляюць ідэю небыцця хваробы, а яшчэ выступаюць раўнацэннымі (з пункту гледжання міфалагічнага персанажа, што ўвасабляе хваробу) заменнікамі чалавека. У прыпеўках, жартоўных песнях, жартах, анекдотах, а таксама шэрагу сацыяльна-бытавых песень вобразна-паэтычная асацыяцыя можа прыцягваць любыя вобразы дрэў, што адпавядае іх фармалізацыі. Дрэва часта маркіруе месца разгортвання дзеяння; у жартоўных песнях з дрэва звальваюцца персанажы і прадметы. У народных жартах і анекдотах пад ліпай снедае пан, галінка б'е пана па носе, мужык крадзе ў панскім садзе грушы ці ў панскім лесе хвойку; каб зрабіць ярмо для вала, жывёлу цягнуць да дуба «кульбаку» прымераць [4, с. 29, 19, 67, 74]. У жартоўных, а таксама сямейна-бытавых, сацыяльна-бытавых песнях, чарадзейных, сацыяльна-бытавых казках дрэва выступае месцам ці/і сродкам пакарання персанажаў.

У загадках прадстаўлены варыянты пераходу з дэндралагічнага на астранамічны, ландшафтна-тапаграфічны, персанажны, прадметна-рэчавы, колеравы, лічбавы і іншыя коды: «*Дуб сякуць, а на ўвесь свет голас ідзе. – Звон*» [8, с. 369]; «*За табою стаіць дуб, ніхто яго не абыдзе, ніхто яго не аб'едзе: ні цар, ні царыца, ні красна дзявіца. – Смерць*» [8, с. 348]; «*Стаіць дуб у чыстым полі, а на ім дванаццаць голляў, а на голлях, як заўсёды, пяцьдзесят і два гнязды. Па сем яек там ляжыць. – Год*» [8, с. 57]; «*Дуб*

*кару знае, а кара дуба не знае. – Ксёндз»* [8, с. 366]; *«Стаіць дуб, на дубу клуб, на клубу лозы, на лозах козы. – Чалавек»* [8, с. 112]; *«Рук многа, а нага адна. – Дрэва»* [8, с. 64]. Вобразнае апісанне чалавека ў загадках накшталт *«На хадулях дзве махалкі, над махалкамі зявалка, над зявалкай два калодзезі, над калодзезямі дзве міргалкі, над міргалкамі рошча, за рошчай чыстае поле, за полем лес»* [8, с. 112] на глыбінным узроўні адсылае да матываў узнікнення Космасу з цела першачалавека, валасы якога сталі лесам, і г.д. Згадаем тут уяўленні пра лес як пра валасы зямлі, а таксама пра калодзеж і вочы як пра ўваходы ў іншасвет і параўнаем творы познетрадыцыйнай паэзіі – песню: *«Роскэдай, братэ, хату // По одный дэрэвэнцэ, // Шчо ты роскэдав мою косойку // По одный волосэнцэ»* (Лелікава Кобрынскага р-на) ці забаўлянку, калі дарослыя праводзяць пальцамі па валасах, ілбе, носе, губах і г.д. дзіцяці са словамі: *«Лес, паляна, горбік, яма, дзве малочных станцыі і вадаправод»* (Цюхінічы Брэсцкага р-на).

**Заключэнне**

Дэндралагічныя сімвалы беларускага фальклору, уступаючы ў сістэмныя адносіны з антрапаморфным, зааморфным, астранамічным, ландшафтна-тапаграфічным, прадметна-рэчавым, колеравым, лічбавым кодамі, паводле пэўных жанравых канонаў аб'ядноўваюць, структуруюць шырокі спектр уяўленняў пра ўзаемадачыненні свету, яго законаў і чалавека, рэпрэзентуюць гэтую інфармацыю ў цэласнай іерархічнай мадэлі і, захоўваючы, актуалізуючы глыбінныя, сакральныя сэнсы і каштоўнасці беларускай (глыбей – праславянскай) традыцыйнай культуры, вызначаюць яе інфармацыйна-знакавую прастору. Дэндралагічны код на разумовым, псіхалагічным, эматыўным узроўнях – адзін з найважнейшых элементаў цэласнага іерархізаванага свядомасна-мастацкага комплексу фальклорных жанраў. Праз дэндралагічную сімволіку, якая захоўвае ў «генетычнай памяці» сакралізаваныя першавытокі, сістэма чалавечых адносін упісваецца ў касмалагічны кантэкст, і наадварот. Гэта тлумачыць факт упарадкаванага з'яўлення дэндралагічных сімвалаў у беларускім каляндарна-, сямейна-абрадавым і пазаабрадавым фальклоры. Сімвалы, якія складаюць дэндралагічны код, – архетыпавыя і адначасова этнічныя. Яны хоць і не з'яўляюцца выключным набыткам беларускай фальклорнай традыцыі, але іх дыстрыбуцыя ў спалучэнні з пэўным наборам сімвалаў іншых кодаў вызначае адметнасць вобразна-эстэтычных, глыбінна-знакавых параметраў фальклорнага слова і, адпаведна, мадэліравання ўяўленняў пра Космас і чалавека ў пэўных жанрах вуснай паэзіі беларусаў. Функцыянаванне дэндралагічных сімвалаў, як і сімвалаў іншых кодаў, непасрэдна звязана з узроўнем культуры данясення фальклорнага твора пэўнага жанру, насычанасцю фальклорнай памяці, ад чаго, у сваю чаргу, залежыць якасць і генетычная цэласнасць фальклорнага інфармацыйнага фонду.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Валачобныя песні / склад. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей, В. І. Ялатаў. – Мінск : Нав. і тэхн., 1980. – 560 с.
2. Замовы / уклад. Г. А. Барташэвіч. – 2-е выд. – Мінск : Беларус навука, 2000. – 597 с.
3. Казкі ў сучасных запісах / уклад. К. П. Кабашнікава, Г. А. Барташэвіч. – Мінск : Нав. і тэхн., 1989. – 663 с.
4. Анталогія беларускага народнага анекдота і жарта / уклад. А. С. Фядосік. – Мінск : Ураджай, 2001. – 236 с.

5. Песні пра каханне / склад. І. К. Цішчанкі, С. Г. Нісневіч. – Мінск : Нав. і тэхн., 1978. – 616 с.

6. Баллады : у 2 кн. / уклад. Л. М. Салавей, Т. А. Дубкова. – Мінск : Нав. і тэхн., 1977–1978. – Кн. 1. – 1977. – 782 с.

7. Радзіны. Абрад. Песні / уклад. Г. А. Пятроўскай, апіс. абрадаў Т. І. Кухаронак. – Мінск : Беларус навука, 1998. – 637 с.

8. Загадкі / склад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. – Мінск : Нав. і тэхн., 1972. – 448 с.

СКАРАЧЭННІ

ФЭАБ – Фальклорна-этнаграфічны архіў кафедры беларускага літаратуразнаўства УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»

***Shved I.A.*** **The dendrological symbols in the Byelorussian folklore genres**

The article is devoted to the semantics of the dendrological symbol in the Byelorussian folklore genres. Used of functiono-semantical and structure-typological methods. Mytho-poetical semantics of the dendrological symbol shows the difference aspects in the various folklore genres and form of the Byelorussian traditional culture. Dendrological symbols established paradigmatic and syntagmatic relations with the symbols of the other cods. It represents to multivalent meanings and connects with the system of the space, natural and metaphysical oppositions in the various folklore genres.